ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 37 (673) | Аўторак, 22 снежня 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

18-га снежня адбыўся агульнауніверсітэцкі адкрыты партыйны сход. Заслухана і абмеркавана справаздача партыйнага камітэта аб яго рабоце па кіраўніцтву перабудовай. З дакладам выступіў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

Матэрыялы са сходу чытайце на 2-й старонцы газеты.

*Канферэнцыі*

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ, ШТОГАДОВАЯ

Наш універсітэт з'яўляецца не толькі вядучай вышэйшай навучальнай установай Беларускага Палесся, але і займае перадавыя пазіцыі ў сваім рэгіёне па навуковых распрацоўках. На рахунку вучоных, выкладчыкаў, супрацоўнікаў і аспірантаў значная колькасць прац ёсць і сёлета. Прывядзём некаторыя папярэднія даныя. У юбілейным для краіны годзе выдадзена чатыры манаграфіі, тры падручнікі, апублікаваны 94 навуковыя артыкулы, у тым ліку 38 ва ўсесаюзных выданнях, дэпанліраваны 34 рукапісы, аўтарамі якіх з'яўляюцца члены універсітэцкага калектыву. У параўнанні з леташнім аб'ёмам у 1,4 разы павялічылася колькасць унутрывузаўскай друкаванай прадукцыі. Ва універсітэце выдадзена 74 работы агульным аб'ёмам 133,4 друкаванага аркуша.

Па выніках навукова-даследчай работы прафесарска-выкладчыцкага саставу за 1987 год на мінулым тыдні ва універсітэце праходзіла XVI навукова-практычная канферэнцыя. Працавалі 34 секцыі. Заслухана і абмеркавана звыш 350 дакладаў па грамадскіх, эканамічных, гістарычных, біялагічных, хімічных навуках, па педагогіцы і псіхалогіі, фізічнаму выхаванню, грамадзянскай абароне і медпадрыхтоўцы па праблемах завочнага навучання. Адметнасцю многіх дакладаў было тое, што іх тэматыка цесна ўвязвалася з юбілейнай датай — 70-годдзем Вялікага Кастрычніка, дасягненнямі савецкай навукі за гэты перыяд, задачамі па ажыццяўленню рашэнняў XXVII з'езда КПСС, наступных пленумаў ЦК КПСС, праблемамі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, пытаннямі перабудовы.

У цэлым канферэнцыя прайшла на добрым арганізацыйным узроўні. Яна паслужыць справе актывізацыі далейшага развіцця навуковых даследаванняў ва універсітэце, больш эфектыўнаму ўкараненню іх вынікаў у вучэбны працэс і народную гаспадарку.

## ПРЫМІЦЕ ЎДЗЕЛ

Адным з важнейшых напрамкаў развіцця вышэйшай школы з'яўляецца ўдзел выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ ў рашэнні актуальных задач вытворчасці. У апошні час з'явіліся новыя нетрадыцыйныя формы такога супрацоўніцтва. У г. Гомелі створаны гасразліковы гарадскі клуб навукова-тэхнічнай творчасці моладзі (НТТМ). Прадпрыемствы горада падаюць заяўкі на тэарэтычныя распрацоўкі або стварэнне неабходных ім прыстасаванняў.

Спецыялісты, жадаючыя удзельнічаць у гэтай рабоце, могуць заключыць дагавор з прадпрыемствам праз клуб НТТМ. Са спісам тэм можна азнаёміцца ў Савеце маладых вучоных і спецыялістаў універсітэта.

**А. СІДАРАЎ,**
**старшыня Савета маладых вучоных і спецыялістаў ГДУ, асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.**

*ІМІ ГАНАРЫЦЦА УНІВЕРСІТЭТ*

## ТАКІ ПРОСТЫ ЗАПАВЕТ



Алена падставіла далонь пад белыя сняжынкі, якія кружыліся ў паветры ў сваім танцы. Некалькі зіхатлівых зорачак адразу ж ператварыліся ў маленькія халодныя кропелькі. Першы снег... Ён заўсёды прыносіць у душу дзяўчыны асаблівыя пачуцці: узнёсласць, радасць, чаканне цуда. І наогул Алена вельмі любіць прыроду ў любую пару года: няхай то будзе белая казачная зіма ці лета з яго пяшчотным і ласкавым сонейкам. На ўсё адгукаецца яе паэтычная душа. Тады і з'яўляюцца ў яе вершаваныя радкі аб прыгажосці роднага краю, непаўторнасці яго краявідаў. Захапленне паэзіяй пачалося яшчэ ў школе. Вершы Алены Шэвелевай друкаваліся ў часопісе «Бярозка», на старонках раённай газеты, а пазней, калі ўжо стала студэнткай гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ, і ва універсітэцкай шматтыражцы. І цяпер вось, у гэты зімовы вечар, калі навокал белае хараство, а паветра такое свежае, што хочацца дыхаць на ўсе грудзі, было на душы ў Алены па асабліваму лёгка. Хутка — Новы год, любімае свята, пасля —сесія, а там і канікулы — цудоўная пара. А кожны прыезд дамоў на студэнцкія канікулы для Алены заўсёды радасць. І не толькі таму, што зноў яна апынецца сярод родных, блізкіх, якія раскажуць ёй пра ўсе мясцовыя навіны, падрабязна распытаюць пра яе вучэбныя справы. Будзе яшчэ адна акалічнасць, якая прынясе нямала хвалюючых мінут. Гэта — сустрэча з любімай школьнай настаўніцай В. Ф. Слісавай, выкладчыцай рускай мовы і літаратуры Забродскай сярэдняй школы, што на Магілёўшчыне. Менавіта яна адыграла ў жыцці Алены Шэвелевай рашаючую ролю. Настолькі цікавымі, захапляльнымі былі яе ўрокі, што дзяўчынка яшчэ ў школе зрабіла свой канчатковы выбар — таксама буду настаўніцай. І цяпер, калі Алена з'яўляецца ўжо студэнткай 4-га курса беларускага аддзялення гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ, былая вучаніца В. Ф. Слісавай абавязкова завітае на канікулах у знаёмы дом, падзеліцца сваімі навінамі, распытае пра родную школу. Зноў прагучаць словы ўдзячнасці чалавеку, які дапамог адшукаць дзяўчыне сваю жыццёвую сцяжынку.

Аб тым, што Алена Шэвелева не памылілася ў выбары прафесіі, сведчаць яе выдатныя поспехі ў вучобе. З першага курса ў яе заліковай кніжцы — пяцёркі. А хіба можа чалавек, якому не падабаецца справа, абраная ім раз і назаўсёды, вучыцца толькі на выдатна? Не. У гэтым Алена ўпэўнена. Трэба ўсёй душой любіць дзяцей, трэба, каб яны гэта бачылі і плацілі табе такой жа любоўю. Тады педагог з цябе атрымаецца. Такі запавет дала А. Шэвелевай яе любімая настаўніца, і яму дзяўчына пастараецца быць вернай заўсёды.

Дзіцячыя сэрцы вельмі адчувальныя на дабрыню. У гэтым Алена пераканалася ў час сваёй работы мінулым летам у педатрадзе. Разам са сваімі сяброўкамі-аднакурсніцамі яна працавала выхавацельніцай вучняў 1—5 класаў у адным з піянерскіх лагераў Гомельскага раёна.

— Тады прыйшло адчуванне, што змагу знаходзіць у сваёй будучай педагагічнай рабоце неабходны кантакт з дзецьмі. Усё залежыць у першую чаргу ад мяне самой, — гаворыць Алена. — Я павінна быць ініцыятарам усяго таго, што можа зацікавіць дзяцей, дапамагчы раскрыць ім перад настаўнікам усе самыя лепшыя рысы. Так было, калі мы з дзяўчатамі арганізавалі і правялі для рабят «Дзень Нептуна», інсцэніравалі казкі...

Пакуль што студэнты 4-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта спрабавалі свае сілы ў педагагічнай рабоце ў час так званай пасіўнай практыкі ў школах горада: дапамагалі настаўнікам праводзіць з вучнямі пазакласную работу. У наступным семестры яны прыйдуць у школьныя класы, каб праводзіць урокі беларускай мовы і літаратуры самастойна. Сярод іх будзе таксама купалаўская стыпендыятка Алена Шэвелева. І калі яна з хваляваннем увойдзе ў клас, ёй прыйдуць на памяць словы любімай настаўніцы: «Любі дзяцей, вучыся бачыць у іх ўсё самае лепшае. Без гэтага нельга стаць сапраўдным педагогам...».

**Т. ДУБЯК.**
**Фота А. Ульянкінай.**

## ПРЭМІІ ЗА РАСПРАЦОЎКІ

Падведзены вынікі рэспубліканскага конкурсу на лепшае тэхнічнае рашэнне па павышэнню тэхнічнага ўзроўню якасці і надзейнасці машын. Сярод яго пераможцаў — і прадстаўнікі нашага універсітэта. Работа калектыву ў саставе загадчыка кафедры фізікі цвёрдага цела прафесара В. А. Балакіна, дацэнта гэтай кафедры І. М. Мельнічэнкі, навуковых супрацоўнікаў У. А. Замятніна і М. П. Купрэева ўдастоена трэцяй прэміі.

У абласным конкурсе па павышэнню надзейнасці машын група спецыялістаў нашага універсітэта пад кіраўніцтвам прафесара В. А. Балакіна атрымала заахвочвальную прэмію за навуковую распрацоўку «Методыка павышэння зносатрываласці высокаскарасных вузлоў трэння».

## Віншуем!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра філасофіі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры КРАЎЦОВУ Валерыю Іванаўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філасофскіх навук.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую педагагічную работу, падрыхтоўку маладых спецыялістаў, актыўную навуковую і грамадскую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін ВЕРАМЕЙЧЫК Васіль Яўстратавіч узнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата парткома і прафкома універсітэта.

## З АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

# ПЕРАБУДОВЕ — УСЕ РЭЗЕРВЫ

**Ужо больш двух з палавінай гадоў у краіне шырокімі машабамі ідзе карэнная перабудова ва ўсіх сферах нашага жыцця. Гэта даволі складаны, сапраўды рэвалюцыйны працэс. Цяпер завяршаецца яго першы этап. Заканамерна Цэнтральны Камітэт КПСС паставіў перад партыйнымі арганізацыямі ўсіх звенняў задачу ўсебаковага і глыбокага аналізу вынікаў сваёй работы па ажыццяўленню перабудовы з мэтай яе далейшай актывізацыі, неадкладнага ўхілення меўшых месца прабелаў і недахопаў.**

18-ГА СНЕЖНЯ ў актавай зале на свой адкрыты партыйны сход сабраліся і камуністы нашага універсітэта. Яны дэталёва абмяркоўвалі работу парткома па кіраўніцтву перабудовай.

Перш за ўсё трэба адзначыць: падрыхтоўка да гэтага сходу мела якасна новы падыход. Загадзя ва універсітэцкай шматтыражцы была змешчана анкета, у якой прадстаўлялася магчымасць камуністам, усім жадаючым выказаць свае думкі аб першых выніках перабудовы, аб тым, што ўжо цяпер неабходна зрабіць, каб яна ажыццяўлялася больш рашуча і паспяхова. Менавіта гэтага патрабуюць ад нас партыя і, у прыватнасці, Асноўныя напрамкі перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

На жаль, запоўненых анкет у партком паступіла не шмат. Гэта яшчэ раз сведчыць аб тым, што многія члены партыі, выкладчыкі, супрацоўнікі ГДУ, а таксама будучыя маладыя спецыялісты — студэнты яшчэ не пазбавіліся пасіўнасці, інертнасці, не сталі на шлях актыўнай жыццёвай пазіцыі. Разам з тым трэба адзначыць, што ў атрыманых парткомам запоўненых анкетах і проста запісках утрымліваліся сур'ёзныя крытычныя заўвагі па істотных упушчэннях парткома ў кіраўніцтве перабудовай, даваліся слушныя парады і рэкамендацыі. Усё гэта ўлічана і ўжо адыграла пэўную ролю ў падрыхтоўцы яго справаздачы да галоўнага партыйнага сходу юбілейнага года, знайшло адлюстраванне ў дакладзе, з якім выступіў сакратар парткома **М. І. Старавойтаў.**

СЁННЯ можна сказаць, што партком у нейкай ступені, большай або меншай, аказвае спрыяльны ўплыў на ўсе бакі універсітэцкай перабудовы, шукае новыя, больш дзейсныя і эфектыўныя формы і метады сваёй работы. Аднак дасягнутае ў ажыццяўленні пастаўленых шматгранных задач — толькі першыя крокі на тым вялікім шляху, які нам патрэбна прайсці, пастаянна павышаючы тэмп. Таму дакладчык апраўдана перш за ўсё скіраваў увагу на тыя пытанні і праблемы, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Даўно агульнавядома: поспех у любой справе перш за ўсё залежыць ад кадраў, іх кваліфікацыі, кампетэнтнасці. Паляпшэнне кадравага саставу універсітэта з'яўляецца першачарговым клопатам парткома. У гэтым напрамку зроблена нямала. Аднак атэстацыя і выбранне прафесарска-выкладчыцкага саставу, укамплектаванне факультэтаў, кафедр, іншых структурных падраздзяленняў лабаранцкім і дапаможным персаналам у далейшым патрабуе яшчэ больш сур'ёзнай адказнасці. Чалавек любога рангу павінен даваць максімальную аддачу на займаемай пасадзе, праяўляць дысцыплінаванасць, ініцыятыву і творчасць. Таму кадравай палітыцы ў дакладзе было адведзена значнае месца.

Шырокае асвятленне ў дакладзе і выступленнях знайшла работа парткома па далейшаму ўдасканальванню вучэбна-выхаваўчага працэсу, паглыбленню і пашырэнню універсітэцкай навукі, хутчэйшаму ўкараненню на ўсіх факультэтах і курсах студэнцкага самакіравання. Пры адчувальным недахопе вытворчых плошчаў цяпер, як ніколі раней, трэба з максімальнай карысцю выкарыстоўваць іх кожны квадратны метр. Між тым, у гэтай справе не ўсё яшчэ даведзена да вырашэння ўзнікаемых пытанняў.

Поспех работы парткома па кіраўніцтву перабудовай у цэлым залежыць ад вынікаў дзейнасці яго кожнага сектара. Асабліва вялікая адказнасць цяпер ускладваецца на камісію па кантролю адміністрацыі за якасцю вучэбна-метадычнай работы. Як зазначыў дакладчык, гэта камісія і яе старшыня член парткома У. І. Міроненка належнай актыўнасці пакуль што не праяўляюць. Гэта нічым не апраўдана, тым больш, што ў названую камісію ўваходзяць такія вопытныя выкладчыкі як загадчыкі кафедр М. І. Аляшкевіч, А. І. Кіеня, Р. Р. Лазько, дацэнты Б. І. Врублеўскі, А. П. Мяшчэрскі, сакратар партбюро факультэта фізвыхавання У. У. Макарэвіч. На этапе перабудовы вучэбна-метадычная работа патрабуе пастаяннай увагі да ўсяго новага, перадавога і яшчэ большай — да ўхілення недахопаў. Прыкметна павінен актывізаваць сваю дзейнасць у гэтай сувязі навукова-метадычны савет, які ўзначальвае член парткома, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў.

ЯК ВЫНІКАЕ са справаздачы парткома, з яго боку быў аслаблены кантроль за ажыццяўленнем навуковых распрацовак, укараненнем іх вынікаў у вучэбны працэс і вытворчасць. Нас прымушаюць задумацца і зрабіць сур'ёзныя вывады наступныя лічбы. За 1987 год, згодна народнагаспадарчага плана, наш універсітэт абавязаны быў забяспечыць эканамічны эфект ад укаранення сваіх навуковых распрацовак у памеры 2 млн. 850 тыс. рублёў. Па стану на 4-га снежня гэты рубеж не дасягнуты і на адну трэць. Яшчэ ніжэйшыя паказчыкі па эканамічнаму і фізічнаму факультэтах. Яны склалі адпаведна 8,6 і 20,3%.

З боку партыйнага камітэта яшчэ не адчуваецца сапраўднай заклапочанасці аб развіцці студэнцкай навукі. Будучых маладых спецыялістаў з першых гадоў навучання ва універсітэце трэба смялей далучаць да ўдзелу ў разнастайных конкурсах, выстаўках, навуковых семінарах, у распрацоўцы дзяржбюджэтных і гаспдагаворных тэм кафедр. Без гэтага сёння нельга падрыхтаваць высокакваліфікаванага спецыяліста.

У полі зроку парткома, як і рэктарата, грамадскіх арганізацый пастаянна знаходзяцца галоўныя моманты прафесіянальнага і грамадзянскага станаўлення будучых спецыялістаў. Вядзецца работа па фарміраванню ў іх палітычнай і маральнай культуры, сацыяльнай актыўнасці. На гэтым напрамку дасягнуты пэўныя поспехі. Аднак у ідэалагічнай рабоце накапілася ў нас і нямала праблем. Распрацоўваемыя мерапрыемствы выхаваўчага характару не заўсёды даюць належную аддачу. У выніку ў студэнцкім асяроддзі назіраюцца зусім непажаданыя з'явы — маральны нігілізм, працоўная і сацыяльная пасіўнасць, маюць месца амаральныя ўчынкі. Партком абавязаны больш рашуча паляпшаць ідэалагічную работу і дамагацца пазбаўлення ад тых студэнтаў, на якіх не аказваюць уздзеяння выхаваўчыя меры, хто прыйшоў ва універсітэт не за ведамі, а дзеля дыплома.

ПЕРАБУДОВА, зазначыў у дакладзе М. І. Старавойтаў, выявіла адну важную асаблівасць. Мы пакуль што псіхалагічна аказаліся не падрыхтаванымі вырашаць задачы па максімуму. Стэрэатып мыслення ў выкладчыкаў, накіраваны на абасабленне свайго прадмета, перабольшванне яго значнасці, што складваўся на працягу многіх гадоў, адмоўна ўплывае на студэнта. У выпадку нездавальняючай падрыхтоўкі спецыяліста мы шукаем прычыну ў скарачэнні вучэбных гадзін, а не ў дрэннай методыцы чытаемых курсаў. Вось і атрымліваецца: кіраўніцтва па перабудове на факультэтах і ў падраздзяленнях як быццам ажыццяўляецца, а пераважная большасць студэнтаў гэтага не адчувае.

Састаўной часткай ідэалагічнай работы з'яўляецца арганізацыя сістэмы эканамічнай і палітычнай вучобы. За яе ўзровень адказвае намеснік сакратара парткома па ідэалогіі Г. Д. Ветлугаеў. Тут таксама ёсць некаторыя недахопы. Перш за ўсё трэба дабіцца максімальнага наведвання слухачамі заняткаў, высокага ўзроўню чытаемых курсаў.

У справаздачы парткома дадзена адпаведная характарыстыка і ацэнка работы кожнага члена парткома. Адзначана, што ў апошні час больш мэтанакіравана працуе на даручаным участку намеснік сакратара парткома старшыня галаўной групы народнага кантролю Ю. А. Праляскоўскі. Аднак яму не трэба абмяжоўвацца арганізацыяй неабходных праверак, абмеркаваннем іх вынікаў на пасяджэннях групы НК, а ўсе справы, як кажуць, даводзіць да рэальнага канца, дамагацца ўхілення недахопаў і парушэнняў.

Значную работу ў напрамку перабудовы праводзіць універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды», адказным сакратаром якой з'яўляецца член парткома В. І. Старакожава. Аднак і ёй ёсць яшчэ над чым папрацаваць. Перш за ўсё трэба змагацца не за колькасць чытаемых лекцый, а за павышэнне іх якасці, наладзіць улік думак і заўваг, выказваемых слухачамі. У перыяд перабудовы больш актыўнай павінна стаць дзейнасць прафсаюзнай, камсамольскай, іншых грамадскіх арганізацый. У многім гэта залежыць ад таго, які ўплыў на іх работу аказвае партыйны камітэт. Як сведчаць асобныя факты, прыкметных зрухаў тут яшчэ не назіраецца. Наадварот, у асобных прафсаюзных арганізацыях факультэтаў і падраздзяленняў знізілася цікавасць да прафсаюзных сходаў, не адчуваецца высокай адказнасці членаў прафсаюза. На абмеркаванне прафсаюзных сходаў у пераважнай большасці выносяцца дзяжурныя вытворчыя пытанні. У гэтым бачацца пэўныя пралікі старшыні прафкома члена парткома М. Н. Мурашкі.

Партыйны камітэт яшчэ недастаткова дапамагае камітэту камсамола і студэнцкаму прафкому, дзе па-сутнасці яшчэ не створана ініцыятыўнага працаздольнага рэзерву выбарнага актыву.

Адзначана аслабленне ўвагі членаў парткома Л. М. Галеевай па кантролю за дзейнасцю факультэта грамадскіх прафесій і В. І. Сіськова — за павышэнне ўзроўню спартыўнай і фізкультурна-масавай работы ва універсітэце.

Неад'емнай часткай перабудовы стала публічнасць яе вынікаў. Тут вялікая роля надаецца шматтыражнай газеце «Гомельскі універсітэт», рэдактарам якой з'яўляецца член парткома У. П. Балога. Калектыў рэдакцыі ў цэлым разумее свае задачы і імкнецца іх вырашаць. Але на старонках газеты яшчэ недастаткова аналізуюцца нашы недахопы, адлюстроўваецца перадавы вопыт. Амаль няма рэагаванняў на крытыку і на выказваемыя на старонках газеты прапановы.

У дакладзе М. І. Старавойтава ўсебакова адлюстравана арганізацыйна-партыйная работа за справаздачны перыяд, адзначана, што на пасяджэннях парткома і партыйных сходах цяпер аналізуецца стыль работы рэктарата, дэканатаў. Аднак слабым звяном у рабоце парткома з'яўляецца кантроль і праверка выканання прымаемых рашэнняў. Яшчэ не вядзецца поўны ўлік крытычных заўваг і прапаноў камуністаў, не даецца адпаведная інфармацыя аб іх рэалізацыі. Не заўсёды своечасова даводзіцца да ведама камуністаў аб выкананні раней прынятых пастаноў. На гэтыя недахопы звернута ўвага сакратара парткома і яго намесніка па арганізацыйнай рабоце Я. А. Семенчука.

АБМЕРКАВАННЕ справаздачы партыйнага камітэта па кіраўніцтву перабудовай праходзіла ў абстаноўцы высокай дзелавітасці і партыйнай патрабавальнасці. Размова ішла перш за ўсё аб тым, дзе допушчаны пралікі, на што неабходна безадкладна накіраваць намаганні для паўнейшага выкарыстання наяўных рэзерваў і магчымасцей. Патрабуецца не толькі паспяхова справіцца з задачамі перабудовы, але і забяспечыць большую прэстыжнасць нашаму універсітэту — вядучай вышэйшай навучальнай установе рэгіёна. Гэта асабліва важна цяпер, калі пераважную большасць спецыялістаў універсітэт пачне рыхтаваць па прамых заказах прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый, гаспадарак розных галін вытворчасці. Само жыццё патрабуе карэнным чынам змяніць адносіны да падрыхтоўкі студэнтаў, іх выхавання, павышэння аддачы ад вузаўскай навукі, умацавання яе тэхнічнай базы. Вострыя праблемы стаяць і перад нашымі грамадазнаўцамі. Словам, задач і клопатаў шмат. Наш поступ наперад залежыць цяпер ад універсітэцкага калектыву ў цэлым і кожнага яго члена ўасобку.

Выступіўшыя на агульнауніверсітэцкім сходзе сакратар партарганізацыі фізічнага факультэта **Т. П. Жалонкіна**, дацэнт кафедры дыфураўненняў **Ю. А. Кашын**, намеснік сакратара парткома старшыня галаўной групы народнага кантролю **Ю. А. Праляскоўскі**, старшыня Савета кафедр грамадскіх навук **У. І. Качаткоў**, рэдактар шматтыражнай газеты **У. П. Балога**, прарэктар па вучэбнай рабоце **Л. А. Шамяткоў**, студэнты **П. Макарэвіч** з біялагічнага і **Г. Маторанка** з эканамічнага факультэтаў, загадчык НДС **Г. С. Міцюрыч**, рэктар універсітэта **Б. В. Бокуць** указвалі шляхі, якімі мы павінны ісці да больш высокіх рубяжоў у перабудове вышэйшай школы. На сходзе гучала аб'ектыўная крытыка. Недаравальна, калі нашай рабоце нярэдка перашкаджае нездаровы маральна-псіхалагічны клімат, як напрыклад, на біялагічным факультэце, дзе ўзнік канфлікт паміж загадчыкам кафедры прафесарам Б. П. Савіцкім і сакратаром партбюро В. А. Хількевічам.

Работа парткома па кіраўніцтву перабудовай у цэлым ацэнена станоўча. Аднак, як адзначалася вышэй, ёсць і нямала недахопаў, ад якіх неабходна пазбавіцца ў самыя сціслыя тэрміны. Партыйны камітэт мае патэнцыяльныя магчымасці, каб у далейшым ажыццяўляць кіраўніцтва перабудовай з неабходным дынамізмам і глыбінёй.

У РАБОЦЕ агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу прынялі ўдзел інструктар аддзела навукі і навучальных устаноў ЦК КПБ **П. І. Брыгадзін**, загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў абкома КПБ **В. М. Збароўскі**, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі гаркома КПБ **В. М. Некрашэвіч**, сакратар Цэнтральнага РК КПБ **Ю. Г. Грыцэвіч**.

**Ю. Г. Грыцэвіч** і **П. І. Брыгадзін** выступілі на партыйным сходзе.

# НАПРАМКІ ДАЛЕЙШАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

## З пастановы сходу

**— Да канца 1987—1988 навучальнага года распрацаваць адзіны комплексны план мерапрыемстваў па перабудове асноўных напрамкаў дзейнасці Гомельскага дзяржуніверсітэта, уключыўшы ў яго прынятыя раней арганізацыйна-палітычныя мерапрыемствы па выкананню рашэнняў XXVII з'езда КПСС, студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, Асноўных напрамкаў па перабудове вышэйшай і сярэдняй спецыльнай адукацыі.**

**(Адказныя — Б. В. Бокуць, Л. А. Шамяткоў, М. В. Навучыцель, М. І. Старавойтаў, М. Н. Мурашка, Н. І. Колтышава, М. Г. Жукевіч).**

**— Рэктарату, дэканатам і кафедрам сумесна з партыйным камітэтам, партбюро і партгрупамі да 15 красавіка 1988 года прыняць рашэнне па ўпарадкаванню структуры універсітэта з мэтай аб'яднання і ўмацавання кафедр і факультэтаў.**

**(Адказн. — Л. А. Шамяткоў).**

**— Кіруючыся рашэннямі XXVII з'езда партыі, студзеньскага (1987 г.) Пленума ЦК КПСС, рэктарату, дэканатам і кафедрам, парткому, партыйным бюро і партгрупам да чэрвеня 1988 года завяршыць работу па стварэнню рэзерва кіруючых кадраў універсітэта (з яго наступным пастаянным абнаўленнем), праводзячы яе на аснове шырокай галоснасці, дэмакратызма, уліку думак партыйных груп і арганізацый, падраздзяленняў адпаведных працоўных калектываў.**

**— Даручыць парткому хадайнічаць перад Гомельскім абкомам КПБ па правядзенню абласной нарады вузаўскіх работнікаў і кіраўнікоў аб'яднанняў і прадпрыемстваў па пытаннях Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай школы на сучасным этапе.**

**(Адказн. — М. І. Старавойтаў).**

**— Парткому, партбюро факультэтаў з мэтай узмацнення кантролю за дзейнасцю розных падраздзяленняў універсітэта, грамадскіх арганізацый, органаў самадзейнасці і масавых рухаў сістэматычна заслухоўваць іх кіраўнікоў на сходах у партгрупах, факультэцкіх партарганізацыях, пасяджэннях партыйных бюро і парткома.**

**— Рэдакцыі шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» (адказн. — У. П. Балога) больш мэтанакіравана асвятляць пытанні перабудовы вышэйшай школы. Для павышэння дзейснасці вузаўскага друку рэктарату, парткому, дэканатам і кафедрам своечасова рэагаваць на крытычныя выступленні газеты.**

